***Зірніце на здымкі польскага часу: на адваротным баку штамп "Фатаграфія М.Глоубермана". Вядомае лунінецкае прозвішча... І адрас майстэрні: "Вуліца Пілсудскага, 12".***

***Праз 53 гады сваю малую радзіму наведаў Ізя Глоуберман — сын фатографа, цяпер грамадзянін Ізраіля. Што прыгадвае пра бацьку?***



# ПАМЯЦЬ СЭРЦА КЛІЧА НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

### ФАТОГРАФ

Мордух Глоуберман нарадзіўся ў Пінску ў 1893 годзе. Чатырма гадамі маладзейшая яго жонка Ліза з дому Лерэнлайт. Мордух вучыўся фотасправе ў лепшага пінскага фотамайстра Вайнтраўба. У пачатку першай сусветнай вайны перасяліліся ў Лунінец. Купілі прыгожы драўляны, вялікі двухпавярховы дом (на гэтым месцы цяпер будынак Аграпрамбанка). На першым паверсе жыла сям'я: у 1916-м нарадзіўся Раман, у 1918 — Ізя, у 1931 — Фаня. На другім паверсе размясціліся фотаатэлье і фоталабараторыя.

Мордух Глоуберман быў фанатам сваёй справы. Ён быў скрытным чалавекам, мала гаварыў, больш слухаў, цудоўна ведаў псіхалогію людзей. Яго акуратнасць і педантызм былі бязмежнымі. Распарадак дня не змяняўся гадамі: рана ўкладваўся спаць, ноччу прачынаўся, выпіваў 2-3 шклянкі чаю з самавару, пасля 4-х гадзін зноў засынаў. У 6 раніцы прыступаў да работы. Ён не быў занадта рэлігійным чалавекам. У сінагогу (яна была побач, на цяперашняй вуліцы Панцялеева) хадзіў двойчы на год: на Новы год і на Іонкапур — дзень выстойваў ля Бажніцы. Быў шчырым хіба што з жонкай, стрымным з дзецьмі і памочнікамі.

Чалавекі два заўсёды дапамагалі фатографу (хаця ён не вельмі іх хваліў). Была яшчэ дзяўчына — рэтушор, заўсёды незадаволеная быццам бы малой платай.

Звычайна выкарыстоўвалі паперу з Германіі — вытворчасці вядомых фірм "Мімоза", "Гебер", "Аква" — апошняя мела прадстаўніцтва ў Лунінцы. Быў час, калі ўлады прымусілі ўзяць заказ на польскую паперу — "Арыён".

У 1939-м Глоуберман не падзяліў лёс многіх іншых заможных лунінчан. Чырвонаармейцы вельмі любілі здымацца, таму завалілі фатографа работай. Нельга было трымаць наёмных працаўнікоў, таму бацьку стаў дапамагаць Ізя. Ледзь не ўпершыню сын пачуў пахвалу: так хутка навучыўся рэтушы. Запас паперы быў, зараблялі добра. Горш пайшлі справы, калі сталі карыстацца паперай савецкай вытворчасці: яна была нядрэннай, але потым рабіліся пузыры. Знайшлі нейкі хімікат, дабавілі ў раствор і якасць палепшылася.

Работа зусім была пастаўлена на "канвеер", калі супрацоўнікі НКУС запрасілі рабіць фотаздымкі зняволеных...

### ЯГО СЫН

Ізя Глоуберман закончыў тарбут (4-класная яўрэйская школа), будынак якога захаваўся яшчэ на вуліцы Прыпяцкай. Пасля паступіў у гімназію (цяпер чыгуначная бальніца). Як сам адзначае, меў нядрэнную галаву, але ленаваўся. Шмат часу аддаваў захапленню: у музычным аркестры іграў на басе. Тым не менш працягваў вучобу ў Пінску ў прыватнай гімназіі, якую закончыў у 1938 годзе.

Пакуль вызначаўся, што рабіць далей, устанавілася новая ўлада. Дзякуючы патрэбнай рабоце, сям'я Глоуберман не цярпела і ў гэты час.

З пачаткам вайны, калі пачалася эвакуацыя, знаёмы супрацоўнік НКУС прапанаваў:

— Даю купэ. Ад'язджай на ўсход разам з сям'ёй.

Але бацькі не згадзіліся: маўляў, перачакаем ліхалецце ў роднай хаце. Да таго ж, Раман, які служыў у Чырвонай Арміі, дзе будзе іх шукаць? Ізю ж прымусілі паехаць. Больш бацьку, маці і сястру ён не бачыў...

Нялростай была і эвакуацыя. З сябрамі паехалі ў Мікашэвічы. У пасажырскі вагон іх не пусцілі: вы "заходнікі", заставайцеся тут. Уладкаваліся ў вагон з лесам. Так, з перасадкамі, дабраліся да Свярдлоўска. І, як бывае ў жыцці, там сустрэўся з братам — той параненым знаходзіўся ў шпіталі. Ізя паступіў у Свярдлоўскі мединстытут. Вучыўся выдатна. Пачаліся маразы, а цёплага адзення ў братоў не было. Паехалі ў Ташкент, працавалі нейкі час на будаўніцтве. Потым Ізя аднавіў вучобу. Ташкенцкія выкладчыкі прапанавалі яму: калі хочаш мець сапраўдную адукацыю, дабірайся ў Маскву. І з 1943 года ён стаў студэнтам сталічнага мединстытута.

Пачуўшы па радыё пра вызваленне Беларусі, ужо ў канцы ліпеня 1944 года Ізя прыехаў у Лунінец. Тут ён даведаўся пра першы расстрэл яўрэяў у 1941 годзе, калі забілі яго бацьку, пра знішчэнне гета ў 1942 годзе, дзе загінулі маці і сястра. Глоуберман вызначыў калочкамі месца вялікай магілы...

Праз год ён выехаў у Польшчу. Адтуль паехаць да Палесціны было даволі складана: не хапала ўрачоў, не хацелі адпускаць. У 1951 годзе ўсё ж дабраўся да "зямлі абетаванай", на год пазней брата. У Ізраілі ажаніўся — жонка родам з Германіі. Жывуць у Іерусаліме. Ён — вядомы ўрач-гінеколаг, яна працавала медсястрой. Сын — бізнесмен у Тэль-Авіве.

### 53 ГАДЫ ПАСЛЯ

Наведаўшы сёлета Лунінец, Ізя Глоуберман пазнаваў і не пазнаваў яго. Захаваліся некаторыя будынкі, вуліцы, але многае змянілася. Двоеснае пачуццё пакінулі сустрэчы з былымі аднакласнікамі па гімназіі — на жаль, беларускія старыя выглядаюць значна горш, чым ізраільцяне.

Але нашы былыя земляк едуць на Лунінеччыну не дзеля турыстычных уражанняў — яны наведваюць магілы малой радзімы, запальваюць свечкі ў памяць аб сваіх родных, вечным прытулкам якіх стала лунінецкая зямля.

**Т.КАНАПАЦКАЯ.**

***НА ЗДЫМКУ: Ізя Глоуберман з жонкай Нінай у Лунінцы.***

*Фота Р.ЖУКА.*